

6 снежня — Дзень юрыста

739

06.12.2020 Автор: Katrin

«Прысвячаючы сябе служэнню закону, урачыста клянуся выконваць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, іншыя заканадаўчыя акты і міжнародныя абавязацельствы Рэспублікі Беларусь…» — словы з прысягі пракурорскага работніка сталі для **Веранікі Манец** дэвізам у рабоце.



Вераніка Эдуардаўна працуе ў органах пракуратуры не так даўно: у мінулым годзе, стаўшы дыпламаваным юрыстам, яна была прызначана на пасаду памочніка пракурора Бярозаўскага раёна, дзе працавала амаль год. Затым апынулася на Пружаншчыне.

— Непадробны інтарэс да юрыспрудэнцыі ў мяне з'явіўся падчас вучобы ў школе, — прызнаецца Вераніка Манец. — Увогуле я марыла стаць следчым.

Але планы памяняліся, калі яна паступіла ва ўніверсітэт. Калі асвойвала ў Брэсцкім дзяржуніверсітэце імя А.С. Пушкіна нюансы судова-пракурорска-следчай дзейнасці,

2023 ГОД МИРА И СОЗИДАНИЯ

Брестоблимущество

УСЛУГ АРЕНД
новый автоб
Автопарк №11 г. Пружан

БЕЛГОССТРА
Представительство по Пружанскому району

ПОДПИШИТЕСЬ НА НАС

РУБРИКИ САЙТА

Выберите рубрику

СВЕЖИЕ ПУБЛИКАЦИИ

юрыспрудэнцыя настолькі зацягнула дзяўчыну, што ўсе чатыры гады навучання яна займалася яшчэ і навуковай дзейнасцю, якую, да слова, працягвае і сёння.

Акрамя таго, сёння памочнік пракурора спалучае работу яшчэ і з вучобай у магістратуры Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО».

— Ужо з першых дзён вучобы ва ўніверсітэце ў мяне была адна мэта — трапіць на работу ў органы пракуратуры. Сёння, хаця я яшчэ толькі пачынаю свой прафесійны шлях, разумею, што прыняла правільнае рашэнне.

На памочніку пракурора Пружанскага раёна ляжыць абавязак сачыць за адпаведнасцю судовых пастаноў па грамадзянскіх справах, а таксама нагляд за выкананнем заканадаўства органамі прымусовага выканання. Ёй ужо давялося падтрымліваць дзяржаўнае абвінавачванне па вялікай колькасці спраў, правесці шмат праверак па кантралюемых накірунках.

У ліку асноўных паказчыкаў эфектыўнасці сваёй работы Вераніка Манец называе аднаўленне справядлівасці, парушаных правоў і свабод грамадзян, інтарэсаў прадпрыемстваў і арганізацый.

— Сітуацыі жыццё падкідвае розныя, — расказвае пра свае працоўныя будні субяседніца. — Нядаўна, напрыклад, на асабісты прыём да пракурора звярнулася жанчына — інвалід трэцяй групы. Яна прасіла дапамагчы ёй выселіць былога мужа. Як высветлілася ў ходзе справы, мужчына не пражываў па пэўным адрасе больш за 25 гадоў, на працягу гэтага часу не прымаў ніякага ўдзелу ні ў аплаце жыллёва-камунальных паслуг, ні ў правядзенні рамонту. Мы дапамаглі жанчыне падаць адпаведную іскавую заяву, і суд яе задаволіў.

Хаця Вераніка Эдуардаўна яшчэ толькі ў пачатку свайго працоўнага шляху, яна ўжо добра ўсвядоміла, што галоўны набытак пракурорскага работніка — здольнасць забяспечваць вяршэнства права, законнасць і правапарадак, абараняць правы і законныя інтарэсы грамадзян, арганізацый, дзяржавы.
Падрыхтавала Марына Вакульская. Фота Сяргея Талашкевіча.

Категория ***Актуально, Профессия***



Предыдущая запись
Склалі ТОП-5 папулярных навін лістапада. А што спадабалася вам?

Следующая запись
У ПалесДУ адкрыта новая спецыяльнасць «Біяхімія»

12.09.2023
Па слядах летняга аздараўленн дзяцей

12.09.2023
Свята хлеба і музыкі

12.09.2023
Рысы следчага — уважлівасць і спакой

11.09.2023
Проста і смачна гатуюць повары ААТ «Ружаны-Агра» і заваёўва узнагароды!

11.09.2023
Час падпісвацца на «Раённыя будні»!


ГОД МІРУ І СТВАРЭННЯ



Свята хлеба і музыкі
12.09.2023



Фотафакт. У «Жураўліным» ужо ўбіраюць ураджай яблыкаў
09.09.2023



Любіць лясную справу ўсёй душой ветэран працы Уладзімір Барысевіч, які прымаў віншаванні з 90-годдзе
08.09.2023



«Белая Русь» запусціла фотафлэшмоб «Калі мы адзіныя — мы непераможныя!», прымеркаваны да Дня народнага адзінства. Далучайцеся!
08.09.2023



Два дзесяцігоддзі сустракае вернікаў Спа Праабражэнскі храм на вуліцы Горка (+многа фота)
08.09.2023

БЕЛТА ТЕМА НЕДЕЛИ

13-09-2023

"Давайте сделаем это, чтобы им стыдно было
Платошкин об отношениях с Польшей

13-09-2023

Глава ВВС США призвал Вашингтон готовить
войне с Китаем

13-09-2023

Пользователями библиотек являются 30%
населения Беларуси

13-09-2023

Фон дер Ляйен пообещала новый пакет помо
Украине на 50 млрд евро

13-09-2023

Лавров заявил, что Запад поставкой Украине
советского и российского оружия нарушил все
контракты

13-09-2023

Законопроект о страховой деятельности
планируется рассмотреть в первом чтении ос

НОВОСТИ ПРЕДОСТАВЛЕНЫ БЕЛТА ©



ГЛАВНЫЙ РЕДАКТОР

Ильющенко Виктор Михайлович

8-01632-4-02-80

КОНТАКТЫ

Наш адрес:
г. Пружаны. ул. Красноармейская, д. 78

E-mail редакции:
RRBud2@brest.by

Приём рекламы:
8-01632-4-03-60, 8-01632-4-03-55


Бухгалтерия:
8-01632-4-03-60

ПОДПИСКА



Час падпісвацца на «Раённыя будні»!

11.09.2023



Калонка галоўнага рэдактара. Нягледзячы на цяжкасці, мы — разам з чытачамі

09.09.2023

САМОЕ КОММЕНТИРУЕМОЕ

Расписание движения поездов по железнодорожной станции Оранчицы + расписание движения автобусов по маршруту Пружаны-Оранчицы-Пружаны (действует с 11 декабря 2022) (15)

Расписание движения городских автобусов по остановочным пунктам (4)

КАЛЕНДАРЬ

Сентябрь 2023

Пн	Вт	Ср	Чт	Пт	Сб	
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	1
11	12	13	14	15	16	1
18	19	20	21	22	23	2
25	26	27	28	29	30	

« Авг



Ответственный секретарь:
8-01632-4-01-08

Корреспонденты:
8-01632-4-03-02,
8-01632-4-03-55,
8-01632-3-58-81

645
414
373

© 2017 Пружаны | «Раённыя будні» | Все права защищены.